ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (791) ● Чацвер, 26 лістапада 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## 28 лістапада — 150 год з дня нараджэння Фрыдрыха Энгельса

*ПАСЛЯ СВАЙГО ДРУГА КАРЛА МАРКСА... ЭНГЕЛЬС БЫЎ САМЫМ ВЫДАТНЫМ ВУЧОНЫМ І НАСТАЎНІКАМ СУЧАСНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ВА ЎСІМ ЦЫВІЛІЗАВАНЫМ СВЕЦЕ.*

*У. І. ЛЕНІН.*

**«Нельга зразумець марксізм і нельга цэльна выкласці яго, не лічачыся з УСІМІ сачыненнямі Энгельса»,—гаварыў У. І. Ленін, падкрэсліваючы вялізную ролю саратніка Маркса ў самастойнай распрацоўцы раду карэнных пытанняў марксісцкай філасофіі і тэарэтычнага прыродазнаўства, палітычнай эканоміі і тактыкі пралетарскай партыі. Творцы рэвалюцыйнай навукі пралетарыяту Маркс і Энгельс на працягу раду дзесяцігоддзяў былі арганізатарамі, кіраўнікамі, правадырамі рабочага руху. Яны стварылі першую міжнародную камуністычную арганізацыю — Саюз камуністаў, члены якога прынялі самы актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1848—1849 гадоў, заснавалі і ўзначалілі І Інтэрнацыянал — Міжнароднае таварыства рабочых.**

**Пасля смерці Маркса Энгельс яшчэ 12 год працягваў быць правадыром міжнароднага пралетарыяту, «дарадчыкам і кіраўніком... сацыялістаў» (У. І. Ленін). З яго імем звязана і далейшае развіццё марксізма, і хуткае распаўсюджанне яго ў шырокіх масах рабочага класа, і распрацоўка праграмных дакументаў маладых сацыялістычных партый.**

**Энгельс выступаў не толькі як тэарэтык, але і як удзельнік практычнай рэвалюцыйнай дзейнасці гэтага перыяду. У канцы XIX стагоддзя формай міжнароднага аб'яднання партыі рабочага класа стаў II Інтэрнацыянал, заснаваны ў 1889 годзе пры непасрэдным удзеле Энгельса. У. І. Ленін—геніяльны прадаўжальнік рэвалюцыйнага вучэння К. Маркса і Ф. Энгельса—прымяняльна да новых гістарычных умоў развіў і памножыў тэарэтычную спадчыну сваіх вялікіх настаўнікаў.**

## ЗАЎСЁДЫ АКТУАЛЬНАЕ

**Асноўная ўвага на апошнім партыйным сходзе фізічнага факультэта была звернута на стан і паляпшэнне сувязі навукі з вытворчасцю.**

**У сваім дакладзе намеснік дэкана камуніст А. А. Лабуда адзначыў, што гэтае пытанне заўсёды застаецца актуальным. Яно ўжо неаднаразова ставілася на пасяджэннях кафедр, а таксама на партыйным сходзе ў сакавіку мінулага года. Тады асноўны ўпор рабіўся на падрыхтоўку аспірантаў. І гэта заканамерна: перш чым даць прадукцыю народнай гаспадарцы, патрэбны высокакваліфікаваныя кадры спецыялістаў. З таго часу звяно выкладчыкаў вышэйшай кваліфікацыі значна папоўнілася: абаронены 3 доктарскія і 15 кандыдацкіх дысертацый. Павялічыўся і штат навуковых супрацоўнікаў, якія не звязаны непасрэдна з педагагічным працэсам. І таму паўстае пытанне не толькі аб якаснай падрыхтоўцы студэнтаў, але і аб канкрэтным укладзе навукі ў вытворчасць.**

**Дакладчык падрабязна расказаў аб тэматыцы гаспадарча-дагаворных работ, аб магчымасцях яе пашырэння і рэалізацыі, аб спецыфіцы вытворчай практыкі студэнтаў, аб тых цяжкасцях, якія яшчэ з'яўляюцца тормазам у наладжванні больш цесных сувязей з заводамі і фабрыкамі краіны.**

**Многа канкрэтных і дзелавых прапаноў было выказана камуністамі тт. Чалеевым, Ганчаровым, Аранскім, Салавым, Ткачовым, Галко, Зубковічам, Зяцьковым і іншымі, а таксама прысутнічаўшымі на сходзе прадстаўнікамі прадпрыемстваў.**

**С. ТУРБАЧ.**

## ВЕСТКІ З ФІЛФАКА

● Студэнты першых курсаў прыступілі да здачы прамежкавых залікаў па мовазнаўству і літаратуразнаўству. Правяраюць веды выкладчыкі і аспіранты кафедр. Такі кантроль дазволіць першакурснікам своечасова выявіць прабелы, паспрабаваць свае сілы, больш эфектыўна рыхтавацца да сесій.

● У мінулую суботу ў актавай зале факультэта пачаў працаваць кінлекторый, арганізаваны Беларускім таварыствам дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Мінскім гаркомам камсамола. Паказ кінафільмаў-расказаў аб нашай гераічнай краіне, аб Савецкай Беларусі, аб моладзі рэспублікі пачаўся дэманстрацыяй фільма «Пасол Савецкага Саюза».

● Тры дні гасцямі філфака былі студэнты-філолагі Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта. Літоўскія студэнты пазнаёміліся са славутасцямі сталіцы Беларусі, прысутнічалі на спартыўным вечары універсітэта.

Перад ад'ездам дадому госці правялі з нашымі спартсменамі сяброўскую сустрэчу па баскетболу.

● Выйшаў чарговы нумар «Камсамольскага пражэктара». У цэнтры ўвагі аказаўся IV курс беларускага аддзялення, які вызначыўся пропускамі заняткаў.

● Сёння, 26 лістапада, адбудзецца камсамольскі сход. Перад студэнтамі выступіць удзельнік XVI з'езда ВЛКСМ член ЦК ЛКСМБ П. Грамыка.

Размова камсамольцаў факультэта пойдзе аб рашэннях XVI з'езда камсамола і задачах камсамольскай арганізацыі.

## ВЫКЛАДЧЫКІ ЎДАСКАНАЛЬВАЮЦЬ ВЕДЫ

Адпаведна плану па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС вучэбны аддзел і аддзел кадраў БДУ распрацавалі мерапрыемствы па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў. Праходзячы стажыроўку на перадавых прадпрыемствах, у вучэбных і даследчых установах, на факультэце павышэння кваліфікацыі (ФПК), папаўняе свае веды значная група навуковых супрацоўнікаў БДУ.

Інспектар па кадрах В. С. Станкевіч расказвае, што зараз толькі на ФПК у розных вну займаецца 26 чалавек. Так, у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава знаходзяцца 13 выкладчыкаў, сярод іх Р. І. Брагін, П. П. Шуба з філалагічнага факультэта, Л. Ф. Смірнова з біяфака і іншыя.

З пачатку будучага года яшчэ 23 выкладчыкі прыступяць да занятхаў ў МДУ, МДПІ, ва універсітэце ў горадзе Тарту і іншых.

Ідучы насустрач з'езду партыі, беларуская вучоныя ўдасканальваюць свае веды, паляпшаюць методыку выкладання, узбагачаюць свае лекцыі новымі матэрыяламі.

А. МІНЕЕЎ.

## ПРАГРАМА КАНФЕРЭНЦЫІ,

### ПРЫСВЕЧАНАЙ ФРЫДРЫХУ ЭНГЕЛЬСУ,

ЯКАЯ АДБУДЗЕЦЦА 27—28 ЛІСТАПАДА У ГАЛОЎНЫМ КОРПУСЕ УНІВЕРСІТЭТА.

### ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

27 лістапада. Пачатак пасяджэння ў 10 гадзін. Актавая зала. Адкрыццё канферэнцыі.

1. **Ф. Энгельс і сусветны рэвалюцыйны працэс.**
   Доктар філасофскіх навук, прафесар **М. Р. Круцько.**
2. **Ф. Энгельс аб сусветна-гістарычнай ролі пралетарыяту і яго рэвалюцыйнай партыі.**
   Кандыдат гістарычных навук, дацэнт **Т. І. Прытыцкая.**
3. **Ф. Энгельс — вялікі мысліцель рабочага класа.**
   Член-карэспандэнт АН БССР, прафесар **В. І. Сцяпанаў.**
4. **Ф. Энгельс і развіццё марксісцкай палітычнай эканоміі.**
   Доктар эканамічных навук, прафесар **С. М. Малінін.**
5. **Ф. Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь.**
   Член-карэспандэнт АН БССР, прафесар **І. М. Лушчыцкі** і кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **М. І. Іоська.**

### СЕКЦЫЯ
марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковага камунізма.

Кіраўнікі секцыі—член-карэспандэнт АН БССР, прафесар **В. І. Сцяпанаў**, доктар філасофскіх навук **М. Р. Круцько.**

28 лістапада. Пачатак пасяджэння ў 15 гадзін. Галоўны корпус, аўдыторыя 419.

1. **Пытанні дыялектыкі чалавечага пазнання ў працах Ф. Энгельса.**
   Доктар філасофскіх навук, прафесар **Р. А. Левін.**
2. **Уклад Ф. Энгельса ў распрацоўку навуковага камунізма.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **М. П. Квочкін.**
3. **Ф. Энгельс аб ролі навукі ў развіцці вытворчасці.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **Э. В. Клёсава.**
4. **Ф. Энгельс і сучасная ідэалагічная барацьба.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **Ю. А. Гусеў.**
5. **Распрацоўка навуковай тэорыі культуры ў працах Ф. Энгельса.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **І. Г. Родзін.**
6. **Ф. Энгельс аб літаратуры і мастацтве.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **С. А. Лысенка.**
7. **Ф. Энгельс аб нацыі і нацыянальным пытанні.**
   Выкладчык **Г. І. Часнакова.**
8. **Ф. Энгельс і Леў Талстой.**
   Кандыдат філалагічных навук **С. Н. Чубакоў.**

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РАЗМОВА АБ МІЛЬЁНАХ

**НАШЫ ІНТЭРВ'Ю**

*Наш карэспандэнт А. МІХАЛЬЧАНКА сустрэўся з кандыдатам фізіка-матэматычных навук, начальнікам навукова-даследчага сектара БДУ Д. С. Умрэйкам і папрасіў яго расказаць аб работах па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы.*

— За распрацоўку прыбораў работнікі НДС атрымалі на ВДНГ 5 медаляў: залаты, сярэбраны і тры бронзавыя. Па тэмах, звязаных з выкананнем гаспадарча-дагаворных работ, былі абаронены кандыдацкія дысертацыі К. Н. Бакіноўскім, В. Н. Вішнеўскім, О. Г. Нібрэнчанка і доктарская — А. Ф. Чарняўскім.

Гаспадарча-дагаворныя даследаванні з'яўляюцца базавымі для практыкі студэнтаў. А прыбыткі ад іх ідуць на пашырэнне матэрыяльнай базы універсітэта.

**— Дзмітрый Сцяпанавіч, як ідзе выкананне гаспадарчых дагавораў!**

— Мы планавалі асвоіць 1,5 мільёна рублёў. На сённяшні дзень гэта лічба рэалізавана. Да канца года думаем асвоіць яшчэ тысяч 200—300.

**— Што ўкаранёна ў вытворчасць!**

— Устаноўлена на радзе суднаў электравылічальная машына для аналізу качкі караблёў у моры. Пры вялікіх крэнах яна дае аварыйны сігнал. На Калінінскім камвольным камбінаце знайшоў прымяненне лічыльнік метражу тканін. Нашы рэкамендацыі пастаянна ўлічваюцца пры будаўніцтве трэцяй чаргі калійнага камбіната ў Салігорску. Выкарыстоўваецца вытворчасцю і шэраг іншых работ.

**— Якія выгады прыносяць універсітэту даследаванні такога характару!**

— Калі гаварыць больш канкрэтна, сродкі, атрыманыя ад выканання гаспадарчых дагавораў, з'яўляюцца састаўной часткай капіталаўкладанняў, якія неабходны для адкрыцця Інстытута фізікі.

**— А якія цяжкасці!**

— Яны, перш за ўсё, у тым, што ў нас няма сваёй вопытна-канструктарскай базы, таму распрацоўка заканчваецца макетам прыбора. Давесці прыбор да серыйнага ўзроўню мы самастойна не ў сілах. Прыходзіцца здаваць макет заказчыку, і ён вырашае яго далейшы лёс.

**— Што вы плануеце на будучае!**

— На базе гаспадарча-дагаворных даследаванняў плануецца адкрыццё галіновай лабараторыі электронна - матэматычных метадаў кіравання вытворчасцю. Базавым прадпрыемствам стане Салігорскі калійны камбінат.

Значна будуць пашыраны сацыялагічныя даследаванні. Першы вопыт абследавання Мінскага камвольнага камбіната прынёс абнадзейваючыя вынікі. Калектыў камбіната закончыў пяцігадовы план 22 верасня. У гэтым ёсць доля працы і беларускіх вучоных.

**Учора адбыўся агульнауніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход. З дакладам аб дзейнасці партыйнай арганізацыі за справаздачны перыяд выступіў сакратар парткома М. К. Гарбачоў.**

*Матэрыялы са сходу будуць надрукаваны ў наступным нумары.*

## «МЫ Ў ЭФІРЫ»

Гэты дзень, вядома, увойдзе ў гісторыю факультэта журналістыкі. На працягу 15 мінут студэнты-журналісты былі гаспадарамі блакітнага экрана: з вучэбнай тэлевізійнай студыі па сцэнарыях, напісаных студэнтамі, ішла перадача «Мы ў эфіры».

Каля тэлевізара, устаноўленага прама ў калідоры вучэбнага корпуса, сабралася, мабыць, самая зацікаўленая аўдыторыя. Выкладчыкам і студэнтам быў паказан агляд жыцця факультэта: пра паездку агітбрыгады ў падшэфную школу, пра клопаты факультэцкай каманды КВЗ. Пра спартыўныя падзеі паведамілі прысутным Уладзімір Трусаў, Віталій Мухін, Наташа Качкар, Уладзімір Дышкавец і іншыя.

Выкладчык кафедры радыё і тэлебачання Валерый Мікалаевіч Шэйн расказвае:

— Была праведзена вялікая работа па стварэнню тэлевізійнай студыі і чатырох рэдакцый на базе трэцяга курса. Рыхтуючыся да першага выхаду ў эфір, улічылі спецыфіку кафедры і зрабілі радыётэлевізійную перадачу. Рэгулярныя выпускі-агляды, мы спадзяёмся, будуць садзейнічаць падрыхтоўцы кваліфікаваных вядучых, апeратараў, рэдактараў, фотакораў і мастакоў.

Цяпер кожную суботу ў 13-00 будзе працаваць вучэбная тэлестудыя.

Студэнт В. Зямскоў, галоўны рэдактар першага выпуску, дадаў, што тэматыка перадач не будзе абмяжоўвацца жыццём факультэта журналістыкі. Патрэбны матэрыялы, якія адлюстроўваюць жыццё ўсяго універсітэта. Таму просьба да ўсіх: прыносьце навіны, прыходзьце да нас самі з расказамі. Чакаем!

М. АЛЯКСАНДРАЎ.

# ПРАГРАМА КАНФЕРЭНЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

### СЕКЦЫЯ
### філасофскіх праблем прыродазнаўства.

Кіраўнік секцыі — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **А. В. Самускевіч.**

**28 лістапада.** Пачатак пасяджэння ў 15 гадзін. Галоўны корпус, аўдыторыя 314.

1. **«Дыялектыка прыроды» Ф. Энгельса і сучасная навука.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **А. В. Самускевіч.**
2. **Ф. Энгельс і некаторыя пытанні дарвінізму.**
   Кандыдат біялагічных навук, дацэнт **А. В. Канстанцінаў.**
3. **Вызначэнне жыцця Ф. Энгельсам і значэнне гэтага вызначэння для сучаснай біялогіі.**
   Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **А. І. Ляўко.**
4. **Ф. Энгельс аб ролі ўнутраных і знешніх фактараў у развіцці вышэйшай нервовай дзейнасці.**
   Доктар біялагічных навук, прафесар **Е. П. Кесарава.**
5. **Ф. Энгельс і дыялектычная тэорыя развіцця.**
   Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт **В. К. Прахарэнка.**
6. **Ф. Энгельс аб мэтазгоднасці ў развіцці жывых сістэм.**
   Аспірант **П. К. Карака.**
7. **Ф. Энгельс аб асаблівасцях матэматычных абстракцый.**
   Асістэнт **Е. А. Дудко.**

### СЕКЦЫЯ
### палітычнай эканоміі.

Кіраўнікі—доктар эканамічных навук, прафесар **С. М. Малінін.** доктар эканамічных навук, прафесар **З. З. Дудзіч.**

**28 лістапада.** Пачатак пасяджэння ў 15 гадзін. Галоўны корпус, аўдыторыя 206.

1. **Ф. Энгельс аб метадалогіі палітычнай эканоміі.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **В. С. Аксельрод.**
2. **Ф. Энгельс аб адносінах уласнасці.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **А. Е. Бураўскі.**
3. **Пытанні палітычнай эканоміі ў ранніх работах Ф. Энгельса.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **У. А. Кулажанка.**
4. **Работа Ф. Энгельса над «Капіталам».**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **М. С. Котаў.**
5. **Праблемы палітычнай эканоміі ў рабоце Ф. Энгельса «Анты-Дзюрынг».**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **А. П. Скуман.**
6. **Ф. Энгельс аб эканамічным развіцці Расіі.**
   Доктар эканамічных навук, прафесар **П. М. Трафімаў.**
7. **Ф. Энгельс і марксісцкая эканамічная думка ў Беларусі.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **М. І. Базылеў.**
8. **Ф. Энгельс аб эканамічных інтарэсах.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **М. Г. Сонцава.**
9. **Крытыка Ф. Энгельсам буржуазных тэорый у палітычнай эканоміі.**
   Кандыдат эканамічных навук, дацэнт **В. І. Максін.**

### СЕКЦЫЯ
### гісторыі.

Кіраўнікі — доктар гістарычных навук, прафесар **Л. М. Шнеерсон,** доктар гістарычных навук, прафесар **А. А. Філімонаў.**

**28 лістапада.** Пачатак пасяджэння ў 15 гадзін. Галоўны корпус, аўдыторыя 414.

1. **Барацьба Ф. Энгельса супраць сацыял-рэфармізму.**
   Доктар гістарычных навук, прафесар **А. А. Філімонаў.**
2. **Ф. Энгельс і рэвалюцыйныя народнікі.**
   Кандыдат гістарычных навук, дацэнт **М. В. Фрыдман.**
3. **Пытанні рускай гісторыі X—XVIII ст. у працах Ф. Энгельса.**
   Кандыдат гістарычных навук, дацэнт **М. П. Баранава.**
4. **Твор Ф. Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы».**
   Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт **В. А. Дарогін.**
5. **Ф. Энгельс аб раннім хрысціянстве.**
   Доктар гістарычных навук, прафесар **Г. М. Ліўшыц.**
6. **Ф. Энгельс аб паходжанні Рымскай дзяржавы.**
   Доктар гістарычных навук, прафесар **Ф. М. Нячай.**
7. **Ф. Энгельс як ваенны тэарэтык.**
   Ст. выкладчык **В. І. Піменаў.**

## Камсамольскае жыццё

*На апошнім пленуме камітэта камсамола універсітэта ішла гарачая дыскусія аб галоўным абавязку студэнта — вучобе. Многае з выказанага патрабуе далейшага абмеркавання і ў выніку — канкрэтных рашэнняў.*

*Прыняць удзел у абмеркаванні гэтага пытання мы запрашаем не толькі студэнтаў, але і выкладчыкаў.*

## ЦІ ТРЭБА ІХ «ВЫЦЯГВАЦЬ»?

Калі падводзяцца вынікі экзаменацыйнай сесіі, амаль заўсёды адзначаецца, што і на гэты раз ёсць 600—700 студэнтаў-хвасцістаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Дарэчы, выдатнікаў крыху больш — 800—900 чалавек. Выдатнікаў заўжды хваляць. Што датычыцца хвасцістаў, то іх чакае непрыемны лёс — стаць пастаянным аб'ектам увагі з боку дэканата і камсамольскай арганізацыі. Заўважым, што не толькі ўвагі, але і дакораў. Звычайны матыў гэтых дакораў — вучэнне з'яўляецца грамадзянскім абавязкам.

Задача камсамольскай арганізацыі — сачыць за выкананнем гэтага абавязку і дапамагаць непаспяваючым, «падцягваць» іх. Здаецца, гэта сапраўды так.

Але паўстае пытанне— які сэнс, які напрамак павінна насіць такая дапамога? Адзінага погляду сярод камсамольцаў не існуе. Адны бачаць задачу камсамольскай арганізацыі ў тым, каб двоечнікаў падцягваць да ўзроўню троечнікаў, троечнікаў — да ўзроўню чацвёрачнікаў. Іншыя лічаць, што барацьба з двойкамі—справа не камсамольскай арга- дэканат, існуе палажэнне аб вышэйшых навучальных установах.

Прадстаўнікі першага погляду разважаюць прыблізна так: «Двоечнікі бываюць розныя. Большасць з іх —першакурснікі, яны хутка выправяцца. Многія не паспяваюць з-за розніцы паміж узроўнем ведаў выпускнікоў школ горада і вёскі. Частка не паспявае з-за хваробы. Усім гэтым таварышам неабходна дапамога. Тыя ж, хто не паспявае з-за сваёй неруплівасці, ляноты, —бясконца малая велічыня ў асяроддзі двоечнікаў, яны не варты і ўвагі».

Староннікі процілеглага погляду мяркуюць інакш. Па пералічаных прычынах не паспявае нязначная колькасць студэнтаў. Большасць жа цягне за сабой «хвост» амаль праз усе гады навучання. І асноўная прычына тут—**абыякавыя адносіны да вучобы.**

Студэнт — гэта, перш за ўсё, чалавек, для якога вучоба—галоўны сэнс жыцця, а не цяжкі «грамадзянскі абавязак». Навошта ж цягнуць да вучобы чалавека, якому вучэнне — абыякава? Навошта павялічваць колькасць троечнікаў, якіх і без таго хапае і якія далёка не ўпрыгожваюць універсітэт?

Таварышы студэнты, выкладчыкі, камсамольскія работнікі, давайце сумесна вырашым гэтае пытанне — размова ж ідзе аб нашых таварышах, лёс якіх не можа не хваляваць.

**А. СЕРАФІМОВІЧ,**
**студэнт IV курса геафака.**

## НЕ СПЯШАЦЦА ВЫКЛЮЧАЦЬ

Ужо стала звычкай, гаворачы пра троечнікаў ці хвасцістаў, сцвярджаць, што не патрэбны нам пасрэдныя спецыялісты. Маўляў, што будзе, калі хірург зробіць табе аперацыю на тройку, купіш на тройку зроблены тэлевізар, паглядзіш пасрэдны фільм, наслухаеш пасрэдную лекцыю... Але практыка гаворыць іншае. Былыя студэнты-троечнікі працуюць бездакорна, становяцца ўдумлівымі, пісьменнымі і добрымі спецыялістамі. Гэта так. І не трэба гэта аспрэчваць. Другая справа — калі? Тады, як толькі заўважаць, што яны засталіся далёка ад сваіх сабратоў. Вось і пачынаюць навёрстваць, запаўняць прабелы, нанава вывучаць матэрыял. Карацей кажучы, працуюць самастойна.

Усё залежыць ад чалавека: хачу—вучуся, хачу—не. Мне здаецца, што галоўная задача камсамольскага актыву — даць студэнту магчымасць зразумець і зразумець своечасова, што вучыцца трэба, і не абы-як.

Я не магу пагадзіцца з А. Серафімовічам, што так ужо адразу трэба і выключаць студэнта. Ніякага жаху няма, калі студэнт у самым пачатку сваёй «кар'еры» атрымае «дрэнна». Тут бы толькі своечасова прыйсці на дапамогу. Галоўнае — каб гэтае «дрэнна» не стала сістэмай. А калі так здарыцца, тады і камсамольскія групы могуць хадайнічаць перад рэктаратам аб выключэнні таго ці іншага студэнта.

**В. АБАКШОНАК.**

## ГАЛОЎНАЕ— АСНОЎНЫ БАЛ

Дзіўная справа: размову пра паспяховасць заўсёды пачынаем з выдатнікаў. А калі іх не надта многа? Пералічым на пальцах і цярэбім хвасцістаў. А вось пра асноўную масу студэнтаў забываем, бо яны і не хвасцісты, і не выдатнікі. А бывае, што і не троечнікі.

Возьмем, напрыклад, наш філалагічны факультэт. Сапраўды, выдатнікаў у нас не так і многа. Але добрых студэнтаў, у поўным сэнсе гэтага слова, шмат. І мы ганарымся гэтым. Няма ў нас так званых пасрэднікаў, амаль не стала хвасцістаў. Значыць, наш акадэмічны сектар дзейнічаў, актывізавала сваю работу камсамольская арганізацыя.

І мне здаецца, што галоўны паказчык паспяховасці — асноўны бал, а не столькі-та хвасцістаў, столькі-та выдатнікаў...

Зараз факультэцкае камсамольскае бюро стала больш увагі ўдзяляць першакурсніку, бо на першых курсах у нас заўсёды былі адстаючыя.

Памятаецца такі выпадак. Аднаго студэнта— не буду называць імя — выключылі за... непаспяховасць. І года не правучыўся. Пайшоў у армію, адслужыў. Вярнуўся на факультэт. Хоць з цяжкасцямі, аднак зноў стаў студэнтам. І як падмяніў хто хлопца, хоць дыплом з адзнакай выдавай. І выдалі б, каб не тая тройка, што ў першым семестры атрымаў. Я да чаго гэта гавару — яшчэ слаба вядзецца ў нас на факультэтах растлумачальная работа. Таму і троечнікі, і хвасцісты, а выдатнікаў усё менш.

**І. РАБЧЫНСКАЯ,**
**сакратар камітэта камсамола філфака.**

## ХВАСЦІСТАЎ СТАЛА Б МЕНШ

Паверце, па вопыту не сваіму, дык сакурснікаў ведаю, што выпрацуй у сабе працаздольнасць—і будзеш каралём. Ёсць у нас студэнты — не абавязкова на фізічным, на любым факультэце, — якія і заняткі прапускаюць і сесіі здаюць паспяхова. Магчыма, я паўтараю думку Абакшонка, але гэта кожнаму зразумела, што ад чалавека залежыць многае.

Давайце ўявім сабе выключна станоўчага студэнта, выключна здольнага да вучобы: успрымае ён усё хутка, і для яго ўсё зразумела. І вось ён добрасумленна сядзіць на ўсіх лекцыях, бо трэба ж сядзець!

Той, хто не ходзіць на лекцыі, — прагульшчык, і яму за пропускі «скуру» знімаюць. А мо' ён у бібліятэцы дзень самастойна працаваў і ўзяў болей таго добрасумленнага?

Я не хачу сказаць, што лекцыі нам чытаюцца сумныя. Але тут, як вядома, мяжы няма. Запатрабаванні студэнтаў растуць з кожным годам. Таму і лекцыі павінны ўзбагачаць іх эрудыцыю, пашыраць светапогляд. А то часам паслухаеш лекцыю і сам сабе задасі пытанне: а што я мог бы зрабіць за гэты час у бібліятэцы, падабраўшы ўсю неабходную літаратуру? Адказы — яны заўсёды розныя: іншы раз, здаецца, зрабіў бы ўдвая больш — гэта па адной дысцыпліне, а па другой, здавалася, і не змог бы разабрацца.

Студэнтаў з аднолькавымі магчымасцямі знайсці цяжка. Аднаму лёгка ідзе тое, другому—гэта. Добра, вельмі добра было б, калі б увялі свабоднае наведванне лекцый, як гэта эксперыментуюць у некаторых універсітэтах. Мо' і лекцыі сталі б цікавейшыя і больш якасныя. І, здаецца, хвасцістаў стала б менш.

**П. КУХАРЧЫК,**
**студэнт фізфака.**

## ВЯСЁЛЫ ЭКСПРЭС

Зборы былі нядоўгімі. Пагрузіліся ў аўтобус, і хутка спідометр пачаў адлічваць кіламетры. Агітбрыгада факультэта журналістыкі едзе ў адну з падшэфных школ Стаўбцоўскага раёна.

Мерна гудзе матор, шуршыць пад калёсамі шэрая стужка шашы. У салоне аўтобуса гучаць вясёлыя студэнцкія песні, чуваць звон гітар.

— Гэта не першая наша паездка, — гаворыць Л. Екель, сакратар камітэта камсамола журфака. — Некалькі разоў студэнты былі гасцямі сельскіх працаўнікоў, выступалі з лекцыямі і канцэртамі. На гэты раз камсамольцы факультэта падрыхтавалі для навучэнцаў не толькі канцэрт мастацкай самадзейнасці, але і сабралі невялікую бібліятэчку, выконваючы свае абавязацельствы ў адпаведнасці з двухгодкай «Камсамол—сельскай школе».

Імчыць аўтобус. Жыхары вёсак з цікавасцю аглядваюцца і доўгім позіркам праводзяць вясёлы экспрэс.

Непрыкметна праляцелі чатыры гадзіны, і вось аўтобус спыняецца каля будынка з ярка ззяючымі вокнамі.

— Прыехалі! Артысты прыехалі!

На тварах сустракаючых свецяцца радасныя ўсмешкі, а ў вачах можна прачытаць пытанне: «Чым вы нас парадуеце?..»

Прасторная спартыўная зала падрыхтавана для такога выпадку як канцэртная. Мноства людзей у ёй.

Пачынаецца гутарка. Студэнты расказваюць аб вучобе, жыцці, вучні дзеляцца сваімі навінамі. Калі журналісты ўручалі падарунак — кнігі для школьнай бібліятэкі, словы падзякі патанулі ў разліве апладысментаў.

Вася Драгавец аб'яўляе аб пачатку канцэрта. І на працягу дзвюх з палавінай гадзін у зале чуваць былі шчырыя апладысменты. Самадзейных артыстаў выклікалі па некалькі разоў.

— Спявае Вячаслаў Асіноўскі, студэнт III курса, — аб'яўляе канферансье.

Слава выконвае адну песню за другой, а яго просяць яшчэ і яшчэ.

Так жа цёпла прымалі выступленні студэнтак II курса Анжэлы Берэйшык і Светы Будзько, нашых першакурснікаў Алы Бялько, Жэні Ушкевіч, Ніны Дзядзюк, Алега Татуна, Сяргея Ціванава і іншых.

Канцэрт закончан, але ніхто не разыходзіцца. Вучні вельмі цікавяцца ўсім — і якія прадметы мы вывучаем, і якія ў нас выкладчыкі... Але ўжо даволі позна. Пара дамоў.

Развітальныя словы, кветкі, запрашэнні бываць часцей, словы падзякі — і зноў імчыць аўтобус, кідаючы ў цемру два промні святла. Да пабачэння, Хатава, да скорай сустрэчы!

**С. БАРЫСАЎ,**
**студэнт II курса журфака.**

*Фота В. ЖУКА.*



# ЛІТАРАТУРНЫЯ ЧАЦВЯРГІ

*У бібліятэцы Палаца культуры прафсаюзаў часта праводзяцца «літаратурныя чацвяргі». Прысвячаюцца яны звычайна юбілеям паэтаў і пісьменнікаў. Так, напрыклад, у верасні такі чацвер быў прысвечан 75-годдзю з дня нараджэння С. Ясеніна, а нядаўна— 90-годдзю з дня нараджэння А. Блока. Актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні вечароў і студэнты-журналісты нашага універсітэта. Рабяты абменьваюцца думкамі аб творчасці пісьменнікаў і паэтаў, чытаюць любімыя творы.*

*У канцы снежня адбудзецца «літаратурны чацвер», прысвечаны паэзіі А. Фета.*

Л. НАРЭЙКА, студэнт.

# ФІНАЛЬНЫ ПАЯДЫНАК

У нядзелю, 29 лістапада, у актавай зале галоўнага корпуса а 16-й гадзіне пачнецца доўгачаканы турнір знаходлівасці і дасціпнасці. У фінальным паядынку сустрэнуцца каманды КВЗ хімфака і журфака.

У першынстве гэтага года чатыры каманды — юрысты, матэматыкі, хімікі, журналісты— аспрэчвалі права змагацца ў фінале. У выніку заўзятых паядынкаў хімікі перамаглі матэматыкаў, а журналісты вырвалі перамогу ў юрыстаў. І вось цяпер фінал. Хто ж заваюе чэмпіёнскую карону і пераходны прыз — крыштальную вазу?

Абедзве каманды пачалі рыхтавацца месяц назад, атрымаўшы тэму дамашняга задання: «Ад 2-х да 5-ці». Увогуле, ўвесь фінальны турнір будзе прысвечан казкам, таму і дамашняе заданне падрыхтавана ў казачным стылі. У нядзелю мы даведаемся, хто здолеў лепш выкарыстаць падрыхтоўчы месяц.

Арганізацыйны камітэт па правядзенню першынства універсітэта сярод каманд клуба вясёлых і знаходлівых выказвае падзяку камітэту камсамола, прафкому і мясцкому за дапамогу і падтрымку.

Ул. КАН, старшыня аргкамітэта.

# У ГАРНІЛЕ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак у №№ 12, 18, 20, 26, 28, 32).*

Асобнае месца ў дзейнасці грамадскіх арганізацый заняў факультэт грамадскіх прафесій, які пашырае эрудыцыю студэнтаў і прывівае ім навыкі арганізатарскай работы. З моманту адкрыцця (1964 г.) да 1970 г. яго закончылі 572 слухачы. Лектарскае аддзяленне ператварылася ў сапраўдную школу лектарскага майстэрства, праз якую прайшло больш 300 студэнтаў.

Дзякуючы намаганням нашай камсамоліі, традыцыяй універсітэцкага жыцця сталі дні адкрытых дзвярэй, пасвячэнні ў студэнты, ленінскія чытанні, сустрэчы з ветэранамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў, паходы па дарогах бацькоў, вечары сустрэч з воінамі ЧБВА і Мінскага гарнізона, студэнцкая тэатральная вясна, агляды мастацкай самадзейнасці, спартыўныя алімпіяды, трэці працоўны семестр, апошні званок, злёты выпускнікоў.

Працоўны семестр 1969 года быў семестрам ленінскай ударнай вахты. На неабсяжных прасторах нашай краіны, ад Брэста да Камчаткі, працавалі 80 будаўнічых атрадаў БДУ імя У. І. Леніна. Імі асвоена 2,5 млн. рублёў капіталаўкладанняў, прачытана для насельніцтва больш 300 лекцый, дадзена некалькі сотнь канцэртаў. Разам з традыцыйнымі будаўнічымі атрадамі працаваў атрад «Рэстаўратар», студэнты якога выканалі вялікі аб'ём работ.

У апошнія гады сталі больш трывалымі сувязі камсамольскай арганізацыі універсітэта са школамі і прадпрыемствамі. Гэтаму садзейнічала падаўжэнне тэрмінаў абавязковай вытворчай практыкі студэнтаў. У 1967 годзе камсамольцы ўзялі шэфства над 56 арганізацыямі г. Мінска і Мінскай вобласці. 28 студэнтаў былі нештатнымі інструктарамі райкомаў і гаркома камсамола, 15—прапагандыстамі рабочых маладзёжных клубаў «Праметэй» і «Глобус», група гісторыкаў па заданню ЦК ЛКСМБ займалася сацыялагічнымі даследаваннямі на некаторых прадпрыемствах горада, фізікі і матэматыкі прынялі актыўны ўдзел у правядзенні рэспубліканскай і ўсесаюзнай алімпіяд школьнікаў, многія студэнты працавалі выхавацелямі ў дзіцячых пакоях, экскурсаводамі і г. д. Працягвалі паспяхова працаваць грамадскія курсы па падрыхтоўцы рабочай моладзі да паступлення ў вну. Студэнты аказалі вялікую дапамогу моладзі, набылі навыкі арганізатарскай работы, навучыліся арыентавацца ў вытворчых абставінах.

У перыяд апошняга дзесяцігоддзя дзейнасць камсамольскай арганізацыі ўжо ўвязваецца ў адзіную сістэму ўсёй грамадскай работы універсітэта. Павялічылася партыйная праслойка сярод камсамольцаў, павысіўся ўзровень арганізатарскай работы. Пры камітэце камсамола створана група па тэорыі і практыцы камсамольскай работы. Цэнтр яе цяжару перамясціўся на курс. Таму яна аказалася больш дзейснай. Аб гэтым сведчыць падрыхтоўка і святкаванне 100-годдзя з дня заснавання І Інтэрнацыянала, 25-годдзя перамогі Савецкага Саюза над фашысцкай Германіяй, 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, 50-годдзя БССР і КПБ, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Вялікай падзеяй у жыцці моладзі стаў Усесаюзны Ленінскі залік. Ён раскрыў лепшыя рысы савецкіх студэнтаў, іх гарачае імкненне звяраць свае справы і ўчынкі з запаветамі правадыра. На камсамольскіх сходах у групах, на патоках, курсах адбылася вялікая размова аб ролі камсамола, павышэнні актыўнасці і баявітасці, фарміраванні светапогляду, аб адносінах да буржуазнага і абывацельскага настрою. Значна павысілася паспяховасць студэнтаў. Экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі на добра і выдатна здалі 82,2 працэнта студэнтаў, па палітэканоміі —78,1. Кожны трэці студэнт падрыхтаваў у юбілейным годзе рэферат або навуковы даклад. Ленінскую працоўную вахту неслі каля 3 тысяч камсамольцаў. Важным вынікам гадавой работы па Ленінскаму заліку з'явілася ўмацаванне сувязей студэнцтва з рабочым класам, калгасным сялянствам, воінамі ЧБВА, працоўнымі іншых краін.

У Ленінскім заліку універсітэцкая камсамольская арганізацыя знайшла форму паўсядзённай работы, адпавядаючую патрабаванням часу. Яе перспектывы ўжо ясныя: неабходна захаваць прынцып індывідуальнай зацікаўленасці камсамольца, сістэматычна кантраляваць выкананне асабістых і калектыўных абавязацельстваў, прынятых камсамольцамі. Гэта дазволіць яшчэ вышэй падняць актыўнасць кожнага студэнта.

Камсамольская арганізацыя БДУ налічвае ў сваіх радах больш 8600 членаў. Гэта згуртаваны калектыў, якому пад сілу рашэнне адказных і складаных задач, што стаяць перад вышэйшай школай. За дасягнутыя поспехі ў рабоце ў сувязі з 50-годдзем камсамола Беларусі ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 23 верасня яна ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**В. СІДАРЦОЎ, кандыдат гістарычных навук.**

*ПОБАЧ З НАМІ*

# ЛЁС ЧАЛАВЕЧЫ

НА СУСТРЭЧУ я ішоў з хваляваннем. Ведаў, як часам цяжка ўспамінаць аб мінулым. І калі пачуў: «Я раскажу вам ўсё...», — уважліва паглядзеў жанчыне ў вочы. Не, яны не плакалі. Яны крычалі нямой боллю, яны палілі агнём, што палае ў сэрцы — брацкай магіле чалавечых пакут і гора, неданесенага да людзей, развеянага попелам на чужой, варожай зямлі...

Лаўлю кожнае слова Аляксандры Адамаўны, сачу за яе тварам, а перад вачыма — нумар. Пяць лічбаў на левай руцэ: 69858. Іх не сцёр час, як ніколі не сатрэцца ў памяці жудаснае мінулае, як заўсёды баліць ранам, пакінутым вайной.

Паслухайце апавяданне аб трагічным лёсе чалавека.

— Дзень гэты памятаю, як цяпер. 22 ліпеня 1943 года ў 6 гадзін вечара фашысты акружылі дом па Заводскай. Грукаюць у дзверы. Пад вокнамі аўтаматы, у дзвярах аўтаматы...

Прывезлі ў гестапа. Пытаюцца: «Дзе атрад?» «Не ведаю ніякага атрада, у мяне дачка, я — маці». Два бугаі секлі бізунамі. Ні жывой мясцінкі на целе. Згублю прытомнасць — адліваюць вадой і зноў б'юць. Запалкі падносілі да твару, клалі дошку на грудзі і душылі, душылі. А потым падключылі ток. Да акрываўленых ран. Аднімалася мова. Ні слова, ні гуку...

Збітую, чорную сарвалі з тапчана і пацягнулі ўніз па лесвіцы. Ногі не рухаюцца — туфлі паўнюткія крыві. Адчынілі дзверы камеры і кінулі на падлогу. Чыесьці рукі падхапілі, узвалаклі на нары. Не ведаю, колькі праляжала ў непрытомнасці. У камеры паўзмрок. Прыгледзелася. У другім кутку нар — жанчына. «Няўжо падаслалі? Каб выведала ўсё, каб падслухала». І так балюча стала, так цяжка. Выцягнула з туфляў шнуркі, звязала. «Прабач, дачунька, прабач, мая Анначка...» Заматала за горла, цягну, колькі сіл. А рукі слабеюць, слабеюць... Не вытрымаў шнурок. Звязала і зноў за шыю. І так пяць разоў. Адны вузлы на шнурку. Ці то ад болю, ці то ад слабасці — страціла прытомнасць.

...Лёс чалавека... Гарчэй палыну выпаў ён на долю Аляксандры Адамаўны. Горкае дзяцінства, горкае юнацтва. Вайна зацягнула яе, слабую, юную жанчыну, у самы крывавы вір. Вайна секла яе бізунамі, калечыла. Вайна пытала жорстка: «Праўда ці смерць?» Смерць. А каты не спяшаюцца. Тады слабыя рукі сцягваюць на шыі шнурок. Каб не пачуў вораг ні слова.

...Лёс. Чаму жыццё не развітваецца з чалавекам, калі жыць далей—адна пакута, калі кожная жывая клетачка супраць жыцця? Няўжо ўсё той жа лёс?..

— Апрытомнела, прашу: «Жанчына, скажыце, што ў мяне так баліць?» Падпаўзла да мяне, абмацала: «У вас шыя парэзана». І зноў у свой куток. Затаілася. І я маўчу. Так і праляжалі ўсю ноч. А ранкам яе павялі. Укінулі ў камеру чорную ад пабояў...

Лёс надоўга звязаў мяне з Надзеждай Каралёвай. Сяброўкай стала.

Пасадзілі мяне фашысты ў бункер з вадой. Вады па шыю. І спіна балючая, і ўсё цела ў вадзе. На дзевяць дзён... Думала, смерць мая тут. Вытрымала і гэту пакуту.

Кінулі ў душагубку і павезлі. Выцягнулі з машыны, вядуць па вуліцы. А на душы светла, чыста. Быццам толькі нарадзілася на свет. Людзей сваіх хочацца бачыць, сказаць ім: «Людзі, за ваша шчасце іду на смерць. Адпомсціце, людзі!»... Нікога на вуліцы. Ні душы.

Паставілі ля сцяны разбуранага дома. Страляюць... А мне ўжо ўсё роўна. Смерць не палохала. Толькі б хутчэй скончыліся пакуты. Прайшлі кулі над галавой. Заселі не ў сэрцы, а ў цаглінах дома.

Зноў у душагубку—і ў турму.

Камера № 17. Дзяўчынка там была. Тоненькая, худзенькая. Пытаюся: «За што цябе?» «Дапамагала партызанам». «Цяпер нам да канца быць разам. Пакуль не загінем».

9 месяцаў турмы, гнілой камеры. Хоць бы глыток чыстага паветра... У турме сустрэлася з Надзеждай Цвятковай. Дагледала як магла, падтрымлівала мае сілы. З ёй мы прайшлі да канца праз усе пакуты і гора. Самыя светлыя ўспаміны аб ёй застануцца на ўсё жыццё. А на прадвесні пагрузілі ўсіх у машыны. На вакзале цягнік чакае са зняволенымі Віцебскай турмы. Шэсць сутак былі ў дарозе. Халадзіна. Голад. Дзяўчынка мая, Клара Топалава, зусім знемагла. Бачу, дубеюць твар, рукі. Пачала расціраць—злуе, гоніць ад сябе, просіць, каб дала спакойна памерці. Пакінеш—замерзне дзіцё. А я ўсё ж старэйшая. 21 год быў ужо...

У дарозе палавіна з нас памерла. Мёртвых і тых, хто не мог самастойна рухацца, — у машыны. Жывых пагналі ў лагер. Туды, дзе дыміліся каміны Асвенцыма...

...Глыбокі, жалобны цень лёг на твар Аляксандры Адамаўны. Сівыя валасы спаўзлі на скроні. Усё цяжэй і цяжэй гаварыць. Успаміны, балючыя, горкія ўспаміны...

— Адпачніце, Аляксандра Адамаўна. Калі ласка. Некалькі хвілін.

— Не-не, я буду працягваць. Я зараз... Вось толькі сэрца нешта. Я зараз.

— Павялі нас у баню. Абстрыглі. Глядзім і не пазнаем адзін другога. Адзенне наша адабралі. Выдалі каму што. На спінах фарбай крыжы намалявалі. На ўсю спіну. Усім крыжы. Усім смерць... Разбілі па пяць чалавек, нумаруюць. Мне вось гэты паставілі: 69858. Тут і прозвішча, і імя.

Некалькі тыдняў—каранцін. Гэта быў страшны морг, дзе жывыя спалі побач з мёртвымі. Нас амаль не кармілі. З вечара клаліся па сем чалавек, раніцай—уставала двое... А каміны дыміліся дзень і ноч. Людзі гінулі, як мухі. Чалавечае жыццё нічога не каштавала.

Выжыла каранцін. Пачалі ганяць на працу. Капалі канавы на балоце. Хадзіць ад лагера аж сем кіламетраў. Пакуль дойдзеш — ногі не рухаюцца. А ля варот вяроўка вышынёй на паўметра—скачы. Не здолееш — куля...

Абутак наш — драўляшкі. Знасіліся мае. Адна засталася ў балоце. Не хапіла сіл выцягнуць з багны. А ўжо снег выпаў. Ступаю па снезе босай нагой. Зняла і другую. Так усе сем кіламетраў. Прапусцілі мяне ў барак першай. Тут і накінулася немка. Збіла, як порхаўку. Салдацкім кованым ботам. Выбіла зубы. За адну драўляшку.

...А гул гармат усё бліжэй. Усё бліжэй дзень вызвалення. Фашысты лютуюць. Мацнейшых адабралі на заводы, слабейшых пагналі ў канцлагер. Канваіры панапіваліся. Сабак адпускаюць. І рвуць сабакі тых, хто адстае ад калоны. Адчуваю, няма сіл больш. Ногі не рухаюцца, адняліся.

Развітваюся з сяброўкамі. А дзяўчаты падхапілі і штурхаюць у сярэдзіну калоны. Так і давалаклі да лагера.

На работу нас ужо не гналі. Трымалі за калючым дротам. Есці зусім не давалі. Відаць, чакалі, калі ўсім будзе канец. Надзя Цвяткова—мужная жанчына. Пад дротам паўзла да выграбной ямы і прыносіла нам то кавалачак бурака, то лупавіны ад бульбы... А праз некалькі дзён прыйшло вызваленне.

...Аляксандра Адамаўна стомлена закрывае твар рукамі. І так маўчыць некалькі хвілін.. А сэрца звініць набатам, звініць... І, здаецца, я чую, як шурхоча на голай зямлі попел людзей, як дымяць крэматорыі, чую брэх сабак і перадсмяротныя крыкі жанчын, чую, як просяць людзі смерці...

Вочы жанчыны ўважліва сочаць за мной. Быццам пытаюць: «Ты ўсё зразумеў? Хоць кавалачкам сэрца ты адчуў, як гэта жудасна? Мы ніколі аб гэтым не расказвалі людзям, з іх хапіла і свайго гора. А вы маладыя. Вам патрэбна ведаць гэта. Каб другія ніколі не расказвалі, ніколі...».

— Вы хочаце ведаць, што было далей?

— Вядома.

— Працавала спачатку пры сапёрнай часці поварам. Дамоў не пісала. Баялася пачуць самае горшае, хоць і жыла ў сэрцы надзея, што ўсё будзе не так. Заўважылі ў часці, што не пішу. Выклікаюць: «Чаму не пішаце?» Растлумачыла. Прымусілі напісаць. А хутка за пісьмом і сама паехала.

У Мінску зайшла да знаёмай. Кінулася мне жанчына на шыю і ўсё адно паўтарае: «Ты жывая, Шурачка, ты жывая!..»

Мяне ж ужо пахавалі. Нехта бачыў, як стралялі ля дома, калі везлі ў турму...

Мама загінула. І сястра загінула. І лёс дачкі невядомы. І ад мужа ніякіх вестак...

А жыць трэба. І як ні цяжка было—усё ж на роднай зямлі, сярод сваіх людзей. Потым і дачушка знайшлася. Зажылі ўдваіх. Муж так і не вярнуўся з фронта...

— Адкуль сілы ў вас бяруцца, Аляксандра Адамаўна? Як пасля ўсіх жудасцей вы змаглі выстаяць, не ўпасці ў роспач?

— А вы думаеце, я ведаю сама? Відаць, лёс у мяне такі.

...Калі б толькі лёс! Ёсць на зямлі людзі асаблівага складу—савецкія людзі. Пройдуць вякі, а чалавецтва не перастане здзіўляцца іх подзвігу, мужнасці, незвычайнай сіле волі і вялікай любві да жыцця. Такі чалавек і Аляксандра Адамаўна Нікуліна.

Як і ў самы цяжкі і адказны час, яна не аднойчы даказвала Радзіме сваю вернасць, адданасць. Здарылася ў Ташкенце бяда, Аляксандра Адамаўна едзе дапамагаць людзям. Працуе ад цямна да цямна. Працуе, бо ведае, як патрэбны ў людской бядзе кожныя працоўныя рукі. А магла б не паехаць. Гадоў ужо нямала і здароўе загублена на дарогах вайны.

* * *

Даўно ўжо скончана гаворка. У вестыбюлі былога хімічнага корпуса — цішыня. Маўчым, узрушаныя. Аляксандра Адамаўна — успамінамі, я—пачутым. Развітваюся з жанчынай і ціха крочу па вячэрняй вуліцы, дзе гул машын, ззянне агнёў, смех і галасы людскія. Людзі спяшаюцца насустрач, людзі абганяюць. Як плынь рачная—людскія лёсы... Іду насустрач людзям і адчуваю, што не здолею глядзець на іх вачыма, якімі глядзеў раней. Неяк па-іншаму стала біцца сэрца пасля апавядання нашага вахцёра Аляксандры Адамаўны Нікулінай. Простай жанчыны з няпростым лёсам...

**Л. ЕКЕЛЬ.**

# СПОРТ, СПОРТ І ПРАБЛЕМЫ СПОРТУ

У мінулую суботу ў актавай зале галоўнага корпуса адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя спортклуба універсітэта. Акрамя студэнтаў, на канферэнцыі прысутнічалі старшыня Белсавета СДСТ «Буравеснік» В. Ф. Пуцькоў, старшыня Мінаблсавета «Буравеснік» А. В. Зыранаў, намеснік сакратара парткома БДУ Г. Я. Рылюк, член рэктарата БДУ Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, дэкан матэматычнага факультэта А. А. Гусак, загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. П. Шапялевіч, выкладчыкі кафедры.



Старшыня спартыўнага клуба БДУ С. М. Макарэвіч сваім дакладам аб выніках работы праўлення СК за 1968—1970 гг. запэўніў усіх, што можна ахапіць неахопнае: у выступленні былі логіка, веданне становішча спартыўных спраў у саветах фізкультуры факультэтаў, увага да нявырашаных праблем.

Па выніках спартакіяды 1969—1970 гг. калектыў фізкультуры БДУ выйшаў на III месца сярод вну рэспублікі і на IX месца ў краіне.

Добра зарэкамендавалі сябе нашы баскетбалісты і шахматысты, гімнасты і валейбалісты, якія займаюць першае месца ў Беларусі.

У нашым калектыве выхаваны чэмпіёны Універсіяды-70 Віктар Шпігаў і Ніна Целяпнёва, чэмпіён СССР сярод юнакоў па бегу на дыстанцыі 200 метраў Барыс Лютарэвіч, II прызёр першынства краіны на гэтай дыстанцыі Юрый Глыбоўскі і іншыя. На міжнародную арэну выйшаў майстар спорту міжнароднага класа па шашках Анатоль Гантварг.

Спортклуб рапартуе, што ў зборную СССР уваходзяць 7 спартсменаў БДУ, у зборную БССР—46 і ў ДСТ «Буравеснік» — 64. Гэта сведчыць аб той вялікай працы, якая праводзіцца па расшырэнню спартыўна-масавай работы і выхаванню сапраўдных майстроў спорту.

5.000 студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта рэгулярна ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. А ў XVIII Спартакіядзе і аглядзе-конкурсе БДУ прыняў удзел 6.901 чалавек.

Дакладчык адзначыў паляпшэнне спартыўнай работы на многіх факультэтах: матэматычным, фізічным, гістарычным і факультэце журналістыкі.

Непакоіць становішча на юрыдычным факультэце, які заняў апошняе месца па выніках спартакіяды. С. М. Макарэвіч прывёў такі прыклад: у вясеннім кросе ўдзельнічала ўсяго 6 (!) чалавек з юрфака, а ў асеннім не было ніводнага. Выступаючы ў спрэчках, старшыня савета фізкультуры юрфака В. Мялешка спасылаўся на тое, што не хапае часу, няма адзінства поглядаў на спорт у партыйнай, камсамольскай арганізацый, дэканата і савета фізкультуры.

Няма ніякай нагляднай агітацыі за спорт на хімічным і юрыдычным факультэтах. Ім варта было б павучыцца ў філолагаў і журналістаў. На іх факультэтах з густам аформлены фотастэнды, якія расказваюць аб спартыўных справах і лепшых спартсменах. І хоць спартыўныя традыцыі тут не такія багатыя, як, скажам, на матэматычным ці фізічным факультэце, адчуваецца калектыўная зацікаўленасць у спартыўных дасягненнях, імкненне дабіцца лепшых вынікаў, адказнасць кожнага за спартыўны лёс факультэта. Аналізуючы работу праўлення спортклуба, дакладчык указаў на слабую работу сектара агітацыі і прапаганды.

Папрок у адрас камсамольскіх арганізацый, па-мойму, вельмі правільны. Многія з іх не кантралявалі ход спартыўнай работы на факультэтах.

Многім саветам фізкультуры трэба пераняць вопыт у матэматыкаў і фізікаў. Старшыня савета фізкультуры матфака **Леў Гарэлік** у сваім выступленні падкрэсліў у першую чаргу адзінства поглядаў спартыўнай арганізацыі і дэканата. Кожнае спаборніцтва праводзіцца з яго ведама. З другога боку, усе студэнты стараюцца абараніць гонар свайго факультэта і таму з усёй адказнасцю адносяцца да праводзімых мерапрыемстваў.

Выступаючыя ў спрэчках паднялі яшчэ шэраг праблем, ад вырашэння якіх залежыць паляпшэнне спартыўнай работы ва універсітэце.

— Як правіла, кожны пачынае з таго, што яму бліжэй за ўсё, што яму баліць. Я скажу аб рабоце нашага клуба турыстаў-альпіністаў,—гаворыць яго старшыня **Саша Люцко.** — Альпінізм Беларусі нарадзіўся ў БДУ. З той пары ён і знаходзіцца ў нас у зародкавым стане. Наш клуб існуе на грамадскіх асновах, таму залы для трэніровак нам прадастаўляюць у апошнюю чаргу, пасля 20—21 гадзіны. Дзе тут ужо займацца па-сапраўднаму. Аднак і з гэтым можна было б мірыцца, калі б не існавала праблема матэрыяльнай базы. Зноў прыходзіцца гаварыць пра залатаныя спальныя мяшкі, зношаныя палаткі і рукзакі.

І ўсё ж альпіністы-энтузіясты правялі масу паходаў па Беларусі, у Карпатах, на Кольскім паўвостраве і у многіх іншых месцах. Аб гэтым хацелася б расказаць нашым студэнтам, аднак нават фотастэнды альпіністаў з'яўляюцца перашкодай і здымаюцца на 2—3 дзень пасля іх вывешвання.

— Добра альпіністам, яны маюць залу для трэніровак,—працягвае размову член зборнай каманды БДУ па цяжкай атлетыцы **Калчановіч.** — Мы ж і гэтага не маем. Ёсць, праўда, памяшканне ў корпусе юрфака, але яно знаходзіцца на другім паверсе, над чытальнай залай. Паспрабуй тут трэніравацца! А можна было б абсталяваць яе і ў нас у паўпадвальным памяшканні юрыдычнага корпуса.

Здаецца, што можа сказаць аб недахопах на матфаку **Леў Гарэлік.** Аднак:

— Ведаеце, наш факультэт — адзін з найбольш масавых. І таму ў нас свая праблема: калі і дзе праводзіць факультэцкія спаборніцтвы? У гэтым годзе, напрыклад, першынство па тэнісу мы праводзілі на адным стале ў вылічальным цэнтры. Можна ўявіць, што гэта была за ігра.

Паскардзілася на недахоп часу для спаборніцтваў старшыня савета фізкультуры філфака **Таня Пшыркова.**

Уважліва слухаў выступленні ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту **Р. І. Васілеўскі.** Ён выступаў адным з апошніх і вельмі правільна ўказаў на тое, што праблему часу і залаў можна было б рашыць раней. Сапраўды, ні адзін факультэт не правёў спаборніцтваў першага этапу XIX спартакіяды па валейболу, баскетболу, настольнаму тэнісу на адкрытых пляцоўках.

Праблемы, праблемы, праблемы... Іх паднялі вельмі многа. **М. А. Шэйнеман** гаварыў аб неабходнасці правільнага выкарыстання спортлагера на возеры Нарач, падкрэсліў, што трэба даць больш самастойнасці саветам фізкультуры—нізавым арганізацыям.

На канферэнцыі былі крытычна ацэнены дасягненні, глыбока прааналізавана становішча спартыўнай работы ва універсітэце, выкрыты ўпушчэнні, недахопы, нявыкарыстаныя магчымасці.

У пастанове канферэнцыі намечаны меры па далейшаму паляпшэнню спартыўнай работы і дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя БДУ. Выбрана новае праўленне спортклуба на чале з Р. І. Васілеўскім і дэлегаты на абласную спартыўную канферэнцыю СДСТ «Буравеснік».

Затым быў зачытан загад рэктара універсітэта аб узнагароджанні каманд і спартсменаў за лепшыя спартыўныя дасягненні.

Першае месца па выніках спартакіяды і агляду-конкурсу БДУ заваявалі спартсмены матэматычнага факультэта. Уручаючы граматы, кубкі і Пераходны чырвоны сцяг Л. Гарэліку, Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў цёпла павіншаваў спартсменаў факультэта з поспехам і пажадаў ім яшчэ большых дасягненняў у XIX спартакіядзе. Другое месца занялі фізікі. На трэцім у спартакіядзе аказаліся гісторыкі, а ў аглядзе-конкурсе — філолагі.

Вельмі многа студэнтаў і выкладчыкаў было ўзнагароджана граматамі і каштоўнымі падарункамі.

У заключэнне адбыліся паказальныя выступленні акрабатаў і гімнастаў, выступіў эстрадны ансамбль «Спін».

**Ул. СКУЛЬБЕДАЎ,**
**студэнт журфака.**

*НА ЗДЫМКАХ: у прэзідыуме канферэнцыі; удзельнік паказальных выступленняў М. Ц. Бязручанка.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



# ІСКРЫСТАЕ СВЯТА

У маіх руках першая кніжка вершаў студэнткі-аднакурсніцы Яўгеніі Янішчыц. Міжволі ўспамінаецца пачатак нашага студэнцкага жыцця, калі мы, яшчэ нясмелыя, знаёміліся, пазнавалі адзін аднаго на ўборцы бульбы ў калгасе. У час адпачынку, ля вогнішча, усе, хто спрабаваў свае сілы ў паэзіі, чыталі вершы. Усіх нас уразілі тады паэтычныя радкі Яўгеніі Янішчыц:

Быццам лістаноша, ля парога
Восень параскідвала лісты.
Воз антонеў выпаўз на дарогу
І рыпіць на восеньскі матыў.

Яны і дасюль не выходзяць з памяці.

Яўгенія Янішчыц нарадзілася на Піншчыне. У гэтым чароўным палескім кутку ўвасобілася для яе прыгажосць Радзімы. На Палессі і прырода і людзі — асаблівыя, і мова зззяе сваімі арнаментнымі фарбамі.

Прыедзь у край мой ціхі,
Тут продкаў галасы,
Тут белыя бусліхі
І мудрыя лясы.
Хапае на Палессі
І сонца і вады.
І што ні двор — то песня,
Што вёска — то сады.

Ці не таму ў маладой паэтэсы такія самабытныя, сакавітыя вершы, блізкія да народных. Шчырасць, адкрытасць, любоў, давер, прызнанне — вось тыя якасці, якімі палоніць яна сэрца чытача. Яе радкі глыбока лірычныя, эмацыянальныя.

Звонка плешчуць вясной крыніцы,
Будзяць вёску маю жаўрукі.
Хай табе ў гэты момант прысніцца
Лёгкі дотык маёй рукі.
Недзе там, ля зялёных плёсаў
Светлы човен штурхае дзед.
Я бягу. Расплятаюцца косы.
Я гукаю — ты чуеш? — цябе.

Пачынаеш чытаць верш — і ўжо не чытаеш, а, здаецца, слухаеш чароўную музыку («І верш цячэ па целе сонным і нават музыкай гучыць...»):

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві.
Нават самая простая з'ява.
(«Ты пакліч...»)

Сонца зачапілася за стрэхі,
Акрапіла мёдам верасы...
«Я люблю-ю!» — нясецца ўдалеч рэха,
«Я люблю-ю!» — азваліся лясы.
(«Не шукаю...»)

Пачуццё любві да акружаючага развіта ў паэтэсы асабліва востра. Яна, любоў, часам пераліваецца ў суцэльную музыку, з-за якой ужо бяда!—не бачна «нянавісці зямной». І зусім справядліва сказаў вядомы балгарскі пісьменнік Антанас Далчаў: «Паэзія памірае там, дзе занадта многа музыкі». Сапраўды: не ўсё на свеце можна толькі любіць. Перанасычаная музыка захлынае, загіпнатызоўвае творцу, і тады ён поўнасцю падуладны толькі ёй, забываючы пра асноўны «свяцільнік паэзіі» (В. Бялінскі) — думку. Думка, важкая думка, якраз і адсутнічае ў такіх вершах паэтэсы, як «Да сустрэчы», «Вясновае», «Верш пра бяссонніцу», «У машыне», «Ты мне патрэбна, як жыццё, як сонца». Ёсць, праўда, у паэтэсы і вершы, у якіх прабіваецца праз эмацыянальнасць і грамадзянскі струмень: «У бабулі Пеланеі», «Памяці М. Сурначова», «Смерць М. Багдановіча» і іншыя. Аўтара хвалюе лёс людзей, жыццё якіх — узор для чалавека.

Пабываўшы ў брацкай Балгарыі, Я. Янішчыц не магла не адклікнуцца аб гэтай сонечнай славянскай краіне. З'явіліся вершы «Пасля наведання Баянскага сабора», «Некалькі радкоў у Балгарыю», «Славянскае застолле».

Паэзія Я. Янішчыц цесна звязана з фальклорам. Аб гэтым сведчыць ужо сама назва зборніка «Снежныя грамніцы» і вершы «Цётцы Марысі», «Пра атаву напомніць прасіла», «Пісьмо ў Прылукі», «Чарнабрыўцы» ды і сама аснова паэзіі —мова.

Хочацца пажадаць маладой паэтэсе і ў далейшым нястрымных пошукаў, удумлівага падыходу да жыцця, самасцвярджэння.

Іскрыстае свята—снежныя грамніцы. Нібы пабываў на ім — такое адчуванне, калі закрываеш першы зборнік вершаў Я. Янішчыц.

**Я. ХВАЛЕЙ,**
**студэнт V курса філфака.**

# ЗАПРАШАЕМ

Эстрадны ансамбль БДУ за апошнія два гады вырас у цікавы калектыў з разнастайнай канцэртнай праграмай. Артысты ансамбля пабывалі ў многіх гарадах рэспублікі і за яе межамі. Яны выступалі ў Кіеве, Гомелі, Барысаве, Гродна, Салігорску і іншых гарадах, давалі канцэрты на маладзёжных будоўлях, у падшэфнай воінскай часці, у калгасах і саўгасах. Усюды артыстаў самадзейнага эстраднага ансамбля «Спін» прымалі цёпла і сардэчна.

Цяпер у нашым рэпертуары каля сарака канцэртных нумароў і вялікая танцавальная праграма.

Для новага росту ансамблю неабходна папаўненне, і мы запрашаем студэнтаў-музыкантаў у наш калектыў.

Е. ГВАЗДКОЎ,
стараста эстраднага аркестра.

**Дэканат, партбюро, прафесарска - выкладчыцкі калектыў, студэнцтва факультэта журналістыкі выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання дацэнту М. Я. Цікоцкаму з выпадку напаткаўшага яго цяжкага гора—смерці БАЦЬКІ.**

**Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола і прафком універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту М. Я. Цікоцкаму з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора—смерці БАЦЬКІ.**

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2000 экз. Заказ 1531. АТ 21912